**УДК 821.161.3.**

# ПЕРААСЭНСАВАННЕ САЦЫЯЛЬНЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ У ТЭТРАЛОГІІ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

***Н.Г. АПАНАСОВІЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*На матэрыяле тэтралогіі В. Адамчыка разглядаюцца сацыяльныя стэрэатыпы, звязаныя з прыходам савецкай улады ў Заходнюю Беларусь у перадваенны час. У тэтралогіі адлюстраваны праявы савецкага, якія маркіравалі жыццё на памежжы ў той час. Пісьменнік раскрывае праблематыку ўспрымання савецкай улады мясцовым насельніцтвам, узаемадзеянні з ёй праз прызму моўнага пытання, надзеі і расчараванні сацыяльнай палітыкай, праявы фармалізму і спекулятыўнасці савецкіх кіраўнікоў. Пераасэнсаванне дадзенага этапу ў гісторыі беларусаў В. Адамчык паказвае з пазіцыі вяскоўца, яго будзённага жыцця, адносін да пераразмеркавання зямлі і ўласнасці. Экскурс у недалёкую гісторыю дазволіў пісьменніку правесці паралелі з тым, што адбылося, раскрыць неадназначнасць сацыяльна-палітычных і культурна-эканамічных пераўтварэнняў любой улады для селяніна-беларуса. Аналіз матэрыялу дазваляе зрабіць выснову пра пазіцыю пісьменніка: разбураныя лёсы, калектывізацыя, высылкі і рэпрэсіі – тая цана, якую заплаціў беларускі народ савецкай уладзе. Прадстаўлены ў тэтралогіі ракурс пераасэнсавання сацыяльных стэрэатыпаў савецкага пашырае тэматыку этнанацыянальнага дыскурсу, з'яўляецца актуальным і на сённяшні дзень.*

***Ключавыя словы:*** *тэтралогія, В. Адамчык, Заходняя Беларусь, савецкая ўлада, рэпрэсіі, лёс беларускага народа.*

**Уводзіны.** У тэтралогіі, раманы якой выходзілі з 1977 па 1991 гг. («Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца», «Голас крыві брата твойго»), В. Адамчык шматаспектна і ўсебакова даследаваў прычыны страты нацыянальнага самаўсведамлення, прапанаваў свой погляд на асэнсаванне трагічнага шляху народа. У гэтым сэнсе тэма ўзаемадачыненняў заходнебеларускага насельніцтва з савецкай уладай разглядалася як адна з прычын дэнацыяналізацыі беларусаў. Пра надзеі і расчараванні, звязаныя з новай савецкай уладай на заходнебеларускіх землях, услед за аўтарам і яго героямі, літаратуразнаўцы пачалі пісаць пасля выхаду трэцяга («І скажа той, хто народзіцца»), і чацвёртага («Голас крыві брата твойго») раманаў з друку. Гэта абсалютна апраўдана, паколькі са з’яўленнем усіх твораў тэтралогіі ў большай ступені стала зразумелай і выніковая канцэпцыя аўтара, і сам час канца 80 – 90-х гг. XX ст. быў больш адкрытым і спрыяльным для пачатку перасэнсавання савецкай спадчыны ў гісторыі і лёсе беларусаў.

На гэты аспект тэтралогіі звярталі ўвагу такія даследчыкі, як Г. Тычко, Л. Корань, М. Тычына, Н. Дамброўская, А. Мельнікава, Н. Суддзева, Т. Грамадчанка, В. Ляшук і інш. У артыкуле «На неспазнаны круг жыцця» (1988) Г. Тычко вельмі эмацыянальна падтрымлівае пазіцыю аўтара, яго «імкненне сказаць усю тую непрыхаваную і непадсалоджаную праўду пра чалавека, якая была і ёсць у рэальнасці» [1, с. 7]. Літаратуразнаўца ўзбуйняе пытанні, якія «выбіваюцца» з палатна традыцыйнага сямейна-бытавога рамана: «Як жа было разабрацца гэтаму зняверанаму народу – хто спрыяе яму, а хто чыніць зло, калі заходнебеларускія мацеры яшчэ не аплакаўшы сваіх дзяцей, што загінулі на польска-германскай вайне, што пакутуюць у фашыстоўскім палоне, ужо павінны насіць жалобу па тых, каго цёмнай ноччу пад аховай стальных чырвонаармейскіх штыхоў вывозяць у невядомае – у Сібір ці якія-небудзь Курапаты? І ці магчыма асабістае чалавечае шчасце, калі твой лёс залежыць то ад паліцыянта Гуры, то ад Назімава ці Нікандравай, якія нават гаварыць з гэтым народам на яго мове не ўмеюць?» [1, с. 7].

А. Рагуля ў артыкуле да 60-годдзя В. Адамчыка (1993), пісаў пра гісторыясофскую канцэпцыю тэтралогіі. На думку даследчыка, пісьменннік паказаў, што грамадскі лад быў напоўнены вайной яшчэ задоўга да яе пачатку, а яна толькі развязала рукі такім, як Рэпка і Камашыла: «Дарма што адзін з іх пайшоў у партызаны, а другі – у краёвую абарону» [2, с. 12]. Паглыблена гэта думка ў артыкуле Л. Корань «Што значыць цяпер чалавек?...» (1996). Аналізуючы прадстаўленыя ў тэтралогіі вобразы прадстаўнікоў савецкай улады, найперш асобу Жэніка Рэпкі, даследчыца мяркуе аб мэтанакіраваным завастрэнні тэмы пісьменнікам. Л. Корань адзначае наватарства В. Адамчыка: «Прынцыпова новае тут – падкрэсленая непазбежнасць з’яўлення партызана такога, як Жэнік Рэпка. Менавіта такім, як Жэнік, дала савецкая ўлада неабмежаваную прастору для самасцвярджэння» [3, с. 173]. Тое, што выяўлена пісьменнікам адкрыта і адназначна – гэта вялікая «ўласць» над чалавечымі жыццямі, якая давала Жэніку права адкрыта і агрэсіўна спаганяць з аднавяскоўцаў і чужых свае застарэлыя крыўды на ўвесь свет з прыходам Саветаў у вірах 1939 г., а з пачаткам Другой сусветнай вайны фактычна паставіла камандзіра партызанскай групы ў адзін шэраг з карнікамі [3, с. 173–174].

Нягледзячы на зварот даследчыкаў да тэмы пераасэнсавання сацыяльных стэрэатыпаў, супрацьстаяння стратэгіям дэнацыяналізацыі, яна не была разгледжана ў поўнай меры і патрабуе больш грунтоўнага і падрабязнага разгляду.

**Асноўная частка.** У першым рамане «Чужая бацькаўшчына», дзеянне якога храналагічна абмежавана восенню – вясной 1938 г., сустракаюцца асобныя згадкі пра бальшавіцкую дзяржаву. Агучваюцца яны ў нараканнях старой Таквілі на змену часу і маралі: «Ад Бога адракліся, камуную цяперака ўсё выдумляюць» [4, с. 125]. А ўспамін Ваўчка аб тым, як ён, захварэўшы, ледзь не пацярпеў ад бальшавіцкага камісара за службу ў польскім

войску, з’яўляецца яшчэ і выразнай ілюстрацыяй таго, як хутка і непрадказальна мянялася жыццё на заходнебеларускіх землях. І як няпроста было звычайнаму чалавеку і прадбачыць гэта, і прыстасавацца. На фоне размоў вяскоўцаў пра набліжэнне вайны з Германіяй прадказанне Язапата Змыслы пра прыход бальшавікоў прагучала абсалютнай фантастыкай, тым больш што і выснову сваю ён зрабіў, убачыўшы ў небе знак у выглядзе чырвоных слупоў: «Прыйдуць да нас з усходу сонца – во што. Бальшавіке прыйдуць першыя, а ўжо потым нямцэ» [4, с. 377].

Фінальная частка наступнага рамана тэтралогіі «Год нулявы» анансавала прыход новай улады. Верасаўцы аб гэтым даведаліся апасродкавана, па смелых заявах і намерах прыхільнікаў Саветаў. Ідэі роўнасці былі прывабнымі, давалі надзею, хаця ў вяскоўцаў не было поўнага прадстаўлення аб тым, як усё спраўдзіцца. У пэўнай ступені адчуванні верасаўцаў, што прадстаўлялі сабой душэўную ўзрушанасць спалучаную з роспаччу, адлюстраваны ў настроі і развагах Імполя Верамея: «Глыбокая, патайная радасць віравала ў яго душы. Што чынілася на свеце, ён выразна не ўяўляў сабе, але ведаў, што чынілася нешта вялікае. … Кажуць, што яны <бальшавікі> будуць адбіраць у асаднікаў і дзяліць на бедных зямлю, што настане роўнасць. Але якая яна, Імполь дадумацца, дапытацца ў самога сябе не мог…» [5, с. 385]. Пры агульнай цікавасці да бальшавіцкіх ідэй з боку вясковых жыхароў і звязаных з гэтым спадзяваннях на пераразмеркаванне зямлі, пісьменнік ужо ў гэтым рамане пазначыў малазаўважныя, праблемныя бакі дзейнасці новай улады. Гэта і прадстаўніцтва нявартых асоб у кіраўнічых органах, і жаданне адабраць і «прысабечыць» чужое, вернутае праз афіцыйнае пераразмеркаванне, і шматлікія выпадкі самаўпраўства і беспакаральнасці, якія сталі праявамі надзвычайнай жорсткасці і бесчалавечнасці.

Неабходна заўважыць, што ў тэтралогіі адсутнічае ідэалагічна-пераможны пафас, не апісаны ваенныя дзеянні, вызваленчая барацьба і г.д. Разам з тым, дзейнасць савецкай арміі прадстаўлена, і зроблена гэта ў рамане «Год нулявы» апасродкавана праз вобраз збавіцеляў-вызваленцаў. Дзякуючы дзеянням чырвонаармейцаў на волю выйшаў скалечаны ў польскім пастарунку Саўка Аўсянік. Воклічу «Таварышы!...Слабода» палітвязні канцлагеру ў Картуз-Бярозе спачатку нават не паверылі, але праз колькі часу Міця Корсак і многія іншыя арыштаваныя ўжо былі вольныя. Аднак на фоне ўсеагульнага лікавання ад вызвалення, нечаканым дысанансам прагучаў адказ Корсака на пытанне пра атэізм бальшавікоў: «Няўжо праўда, што бальшавікі не вераць богу? – Праўда, дзядзька, – Міця жахнуўся, што сказаў гэта» [5, с. 416].

Цяжка ўспрымальная ды мала зразумелая для вясковага чалавека інфармацыя маркіравала атмасферу пачатку трэцяга рамана «І скажа той, хто народзіцца». Для сялян «бязбожжа» бальшавіцкай ідэалогіі стала пунктам перасцярогі, дадало недаверу, бо людзі, якія не хрысцяць сваіх дзяцей і не вянчаюцца – «хіба нехрысці»? Чаго варты абаронца бедных Жэнік Рэпка, што так лёгка замяніў іконы на партрэт Сталіна? Стрымана-саркастычны адказ конніка з вайсковага абозу пачуў стары Літавар на пытанне аб веры ў бальшавікоў: «Дедушка, ни мы к богу не имеем отношения, ни бог к нам…» [6, с. 6] Але хутка нахабна-п’яная заява, вымаўленая пад чырвоным сцягам, абвясціла аб поўным усталяванні новай ідэалогіі – ідэалогіі бязбожжа: «Кончыўся касцёл, цётка, настала кіно» [6, с. 219].

У самым пачатку трэцяга рамана аўтар на першы погляд нібы супярэчыць сабе і запэўнівае чытача ў тым, што «ўсё было, як спрадвеку…», адначасова прадстаўляючы стракаты калейдаскоп жыццёвых змен. Пазней, паводле разгортвання аповеду, знікае кантэкст супярэчаннння. У парадыгме проціпастаўленняў польскае паступова змянілася на чаканае, але незнаёмае і незразумелае савецкае. Як высветлілася з цягам часу – таксама варожае, вельмі жорсткае і далёкае ад таго, што ў вясковым асяроддзі лічылася справядлівым і правільным. Прыход савецкай улады даваў надзею, змяняў акцэнты, але па-сутнасці сітуацыя бяспраўнага становішча селяніна перад уладамі не змянілася. Першай праявай нязвыклага стаў вайсковы абоз. Гэта новае відовішча – відавочна агрэсіўна-ваяўнічае, са «страшным жалезным грукатам», «настаўленымі duламі гармат», абыякавае і п’яна-разгульнае, з пераборам залівістага баяну, нетутэйшымі тварамі людзей ды невядомымі жывёламі. Назіранне і старых, і маладых за абозам у рамане напоўнены сімвалічным зместам. В. Адамчык адразу, з першых старонак, нібы разводзіў тых людзей, што прадстаўлялі новую ўладу, мянялі вясковае жыццё, і саміх вяскоўцаў.

На пачатку аўтар паказваў верасаўцаў староннімі назіральнікамі, разам з тым зацікаўленымі і ўстрывожанымі. Але за навінамі пра рабочую гвардыю, што раззброіла склад стшэльцаў, кіравала ў Дварчанах і харчавалася адабраным у асаднікаў, займалася чытаннем газет, напісаных нязвыклай кірыліцай, хвалілася большае, пра што маўчалі або не мелі адказаў вяскоўцы. Яны моцна трывожыліся пра лёс блізкіх, пра тых, хто служыў у польскім войску або быў у зняволенні. Паступова кола размоў звязала ўсіх, падключыла кожнага да таго, што павінна было адбыцца праз найважнейшае для сялян зямельнае пытанне. Пасля заявы аб стварэнні дварчанскай гвардыяй камітэта па падзеле зямлі, не вытрымаў нават Улас Корсак, які дагэтуль слухаў мужчынскую гаворку зводдаль і ўступіў у перапалку толькі цяпер: «Чужое забраць лёгка, сваё нажыць цяжэй» [6, с. 7]. Нечакана «з хіханькаў і жартаў усё абарочвалася на сур’ёз і сварбу» [6, с. 8]. Перапыніла спрэчкі нечаканая навіна па арышт бальшавікамі Аўсяніка. Шчыры барацьбіт за ідэалы бальшавікоў, скалечаны ў турмах за свае перакананні, у імкненні да парадку і законнай справядлівасці, ён быў супрацьлегласцю свайму паплечніку – бязлітаснаму і жорсткаму Жэніку Рэпку.

Нельга абмінуць увагай каментар Ікона Жытка аб арышце Аўсяніка: «Ён жа ў цюрмах сядзеў, ажні мох на шчоках парос. Яго ж цяпер свята» [6, с. 8]. Гэта фраза выразна паказвае, што прыход Саветаў для верасаўцаў – гэта чарговая змена ўлады, якая, нягледзячы на прывабныя заявы, не настолькі блізкая, каб адчувалася «сваёй». Тым больш, што і факт «чыстай» біяграфіі для многіх вяскоўцаў паступова пераўтварыўся ў рэальную праблему.

У рамане «І скажа той, хто народзіцца» аповед пра дзейнасць Саветаў на заходнебеларускай тэрыторыі займае адно з цэнтральных месцаў. В. Адамчык, з вялікай увагай да дэталяў і дробязяў, апісвае пераўтварэнне заходнебеларускага краю ў савецкі. З прыходам новай улады з’явіліся камітэты і сходы, аддзелы і начальнікі,

мітынгі і транспаранты, чырвоныя сцягі і абозы. Жыццё стала вымярацца пяцілеткамі і планамі, нормамі і праверкамі. Прастора агучылася пералівам баяна, вясёла-разгульнымі спевамі, лірычна-тужлівымі песнямі, шалёнымі скокамі. Рассмакавалі мясцовыя мужчыны «Маскоўскую» гарэлку, а нязвычная брынза спадабалася не ўсім. Злоты замяніў рубель, пеленягркі сталі медсёстрамі, ровары – веласіпедамі, а назвіска памянялася на фамілію. Звычнае «сын Антося і Зосі» не падыходзіла, правільна цяпер было так: «Я тэраз не Багна, а Багуслава Іванаўна» [6, с. 135].

Не абмінуў аўтар і ўзаемныя міфы «ўсходнікаў» і «заходнікаў» пра жыццё адно аднаго. Прыхільнае, зацікаўленае стаўленне многіх вяскоўцаў да ўз'яднання было звязана найперш з упэўненасцю ў добрым і заможным жыцці ў Расіі, бо патрэбных сялянам «солі і запалак у бальшавікоў даволі» [6, с. 20]. Прапанова выезду на заробкі ў Данбас многім жыхарам памежжа, знаёмым са з'явай гастарбайтарства, падавалася шматабяцальнай. Наадварот, прадстаўленні пра Заходнюю Беларусь як пра занядбаны, адсталы край былі распаўсюджаны сярод тых, каго скіравалі наладжваць жыццё. Практыкант, які абыходзіў вясковыя двары з мэтай медагляду насельніцтва, вельмі здзівіў Міцю сваімі меркаваннямі: «Галеча тут у вас была, што людзі не ў чаравіках, нават не ў лыкавых лапцях, а ў плеценых каробачках хадзілі» [6, с. 184]. Корсак пагадзіўся з тым, што «галечы» і «бядоты» ў краі многа, але распавёў пра тое, што «Наваградак – гэта ж не вёска, дзе можна сустрэць лучыну. Электрычнасць там ёсць, вядома, і радыё» [6, с. 184].

Маркераў і знакаў новага жыцця стала шмат, і гэта нязвычнае верасаўцы ўспрымалі і з цікавасцю, і з перасцярогай. З першых старонак рамана В. Адамчык паказаў спецыфіку мыслення заходнебеларускага чалавека, які да любой новай улады ставіўся з пэўным скептыцызмам, насцярожанасцю ды абачлівасцю. Гэтая вясковая засцярога была выяўлена Міцем Корсакам у час першага сходу, на які з вялікай цікавасцю прыйшлі з кожнай хаты. Ён «сядзеў, уважліва прыглядаючыся да людзей і бачыў, што верасаўцы да ўсяго новага прымяркоўваюцца так, нібы ідуць першы раз цераз незнаёмую хісткую кладку: і перайсці трэба, і не ўваліцца хаця б» [6, с. 44]. У апісанні сітуацыі выразна выяўляецца і пазіцыя аўтара, і глыбіня разумення ім народнай псіхалогіі: на гэтай тэрыторыі, з гэтымі людзьмі ўжо многае было, і сярод шматлікага новага вяскоўцу-памежніку выразна праглядалася мінулае. Прадстаўнікоў рабочай гвардыі мясцовае насельніцтва ўспрымала, як «цяперашніх паліцыянтаў» [6, с. 14]. Параўноўваючы валасны камітэт з гмінным, стары Літавар з'едліва сказаў упаўнаважанаму: «А я думаў, што іншае… Засядаў у той радзе Янка Вайтовіч, а цяпер ты будзеш?» [6, с. 39] Хутка былі даведзены нормы, часам непад'ёмнай для вяскоўцаў, новай шарваркі – «чырвоным абозе». Клуб размясціўся там, «дзе было агніста каляёва». Адно толькі кіно, стала «найбольш дармовае», ды ці настолькі цікавае: пра трактарыстаў? Хітра-лісліві доктар-практыкант Лапуць, прысланы разам са студэнтамі з Мінска для «надворнага абыходу» і медыцынскай дапамогі вяскоўцам, збянтэжыць Міцю парадамі аб тым, як трэба «правільна» сябе паводзіць у новых умовах. Медык шчыра не зразумее Міцеву адмову «расстарацца» паркалю ў спекулянтаў. Папрок у незгаворлівасці, намёк – «у нас таксама не любяць фанабэрыстых» [6, с. 185] і пагроза «не лезці на ражон», моцна напомнілі хлопцу словы польскага паліцыяната Гуры. З прыходам бальшавікоў верасаўцам прыйшлося не толькі вучыцца новым словам, але і прызвычайвацца да не ў поўнай меры зразумелай рускай мовы. Ніхто з прадстаўнікоў савецкай улады, дасланых на заходнебеларускія землі, не ведаў мясцовую гаворку. Новы «председатель волоскомитета» Нікандрава, чытаючы складзены вопіс «имущества», пыталася ў Царыка, «што гэта за кракаўскія хамуты і што гэта за вазок, плецены з ракітніку» [6, с. 280].

В. Адамчык, тонка і смела для часу стварэння твораў, завастрыў праблему савецкай кіраўнічай палітыкі і раскрыў яе апасродкавана, але вельмі выразна, праз мову, імёны і змену гендарных роляў. Новая начальніцажанчына, прызначаная замест Царыка, моцна ўразіла тутэйшых жыхароў і кароткай стрыжкай, і патрабавальнапрынцыповымі адносінамі да фармальнага боку справы. Яна актыўна ўзялася наводзіць парадкі, але ніводнага разу не запыталася ў былога старшыні аб жыцці людзей у незнаёмым для яе месцы.

Прыстасоўвацца і вынаходзіць спосабы паразумення з новай уладай прыйшлося вяскоўцам. Вельмі паказальным у гэтым сэнсе стаў прыдуманы верасаўцамі зварот «пане-таварыш». Хоць яны і імкнуліся вітацца «на рускі манер» ды з большага разумелі рускую гаворку, мова была адным з тых маркераў, што выразна выявіла аддаленасць улады ад клопату і жыцця звычайнага чалавека. Калі на першым сходзе ў Верасаве ўпаўнаважаны крыва ўсміхаўся на «пана-таварыша», імкнуўся тлумачыць, згаджацца на прапановы верасаўцаў, то на пасяджэнні вясковых камітэтаў у Дварчанах ад вымаўленага на беларускі манер нязвыклага «Рахматул*авіч*» замест «Рахматул*аевіч*», начальнік зямельнага аддзела бліснуў вачыма і ўздрыгнуў «яршыстым бобрыкам». Таварыш Назімаў не пагадзіўся счакаць тых, хто спазняўся, гаварыў канцылярскай мовай так, што Царыку ўвесь час прыходзілася ператлумачваць прысутным. У час першага сходу вяскоўцы вучыліся галасаваць, адчувалі надзею на чынны ўдзел у справах, аднак ужо на сустрэчы ў Дварчанах прадстаўнікам вясковых камітэтаў прама ўказалі, за што яны адказваюць і чаго вырашаць не могуць. Так, жаданне даслаць ліст на імя Сталіна, дзеля тлумачэння канфлікту і апраўдання таго, хто «пагарачыўся», падпісаны ўсёй вёскай, выклікаў насцярогу і жаданне «посоветоваться». А просьба цыган аб жыллі, якая была відавочнай маніпуляцый і пазабаўляла прысутных старшынь вясковых камітэтаў правамоцнай самастойнаці, скончылася нечакана безапеляцыйным тлумачэннем: «Такие дела <перадача будынкаў> решает временный уездный комитет, а не вы» [6, с. 69].

В. Адамчык паказаў безгаспадарлівасць, фармалізм, спекулятыўнасць новай улады. Адзенне, добрая мэбля з сядзіб асаднікаў аказаліся ў кабінетах і шафах камітэтчыкаў. Ад знішчэння прыйшлося ратаваць кнігі. Нават руплівы прыхільнік савецкай улады, шчыры беларус Царык, што неаднаразова пакутаваў ад польскіх улад, не змог выстаяць перад спакусай. За кароткі час кіравання валасным камітэтам ён пасправунеў, а ў скураным паліто,

з гадзіннікам на ланцужку, пачаў выглядаць такім франтам, што яго, жанатага, нават пацягнула да дзяўчат. З'явіліся ў яго за гэты зусім кароткі тэрмін кіравання валасным камітэтам гонар і пыха, што зрабілі «па-начальніцку непадступным і самавіта важным».

Праз лёс рэпрэсаванага Аўсяніка В. Адамчык распачынаў гаворку пра гэты страшны бок бальшавіцкага рэжыму. Арышт Саўкі сімвалічна адкрываў наступленне часу даносаў і паклёпаў, пошуку ворагаў сярод «сваіх». Тэма рэпрэсій паказала не толькі маштаб і спецыфіку з'явы на заходнебеларускіх землях, але раскрыла тыя згубныя светапоглядныя і псіхалагічныя змены, што паступова адбываліся ў свядомасці не толькі ахвяр, але і тых, хто дзейнічаў з пазіцыі ўлады. Для Ваўчка, які некалі нават праз удзел у ваенных дзеяннях не змог здабыць сабе права на кар'еру і лепшае жыццё пры Польшчы, неспрыяльнай аказалася сітуацыя і пры Саветах. Менавіта праз службу ў легіёнах ён патрапіў у спіс тых, «хто трохі замараны» [6, с. 27]. Гэта стала перашкодай не толькі для выбрання ў камітэт, але для атрымання падзеленай асадніцкай зямлі, нягледзячы на тое, што Марцін быў шчыра захоплены новымі ідэямі і магчымасцямі: «Сённяшнім светам я і сам не ўседзеў бы ў Верасаве. Вунь усе хлопцы едуць на шафёрскія курсы. А хто і ў шахты – на заработкі» [6, с. 82]. Кардынальна перамяніўся з прыходам Саветаў і пачаткам рэпрэсій і лёс Вайтовіча. Былы вясковы солтыс ператварыўся ў ахвяру: цудам выратаваўшыся з пекла Полацкай турмы, згубіўшы сувязь з высланай у далёкі Казахстан сям'ёй, па вяртанні ў родныя мясціны ён паспрабаваў уладкаваць сваё жыццё ў акупацыйны час па іншых законах і маралі.

Вельмі кароткім аказаўся тэрмін даверу новай улады нават да такіх, як Царык і Міця Корсак. Шчырыя прыхільнікі новых парадкаў воляй лёсу вымушаны былі ўдзельнічаць у рэпрэсіях аднавяскоўцаў і самі сталі ахвярамі карнай машыны. Лаўрын Царык адбыў і адгараваў у турмах усіх уладаў, што мелі дачыненне да заходнебеларускіх земляў, дзе «асунуўся, высах, змяніўся і пастарэў» [7, с. 81]. На сваім вопыце ён зразумеў і сутнасць новай: «Гэтая ўлада высока падымае чалавека. Але калі апусціць, бывае, то аж зубы затрашчаць» [7, с. 232]. Пры сустрэчы з Міцем ён прызнаўся: «Смяяцца, брат, не магу… Усе зубы высыпаліся яшчэ ў Гародні, а потым у Баранавічах, калі ўжо ўзялі свае…» [7, с. 81].

Не пасаромеўся заявіць пра недавер спакутаванаму ў турме Міцю Корсаку нічога не варты прадстаўнік рабочай гвардыі Імполь Верамей: «Такім як ты, не вельмі ўжо і давер» [6, с. 16]. Нібы ведаючы будучыню, стары Корсак перасцерагаў сына ад супрацоўніцтва з новай уладай, папярэджваў, каб яму не прыйшлося за дзяльбою зямлі складаць спісы на арышты аднавяскоўцаў. У вобразе Міці Корсака пісьменнік раскрыў парадоксы часу і трагізм чалавечага лёсу. Шчырая праца дзеля народа пры Саветах стала для яго пачаткам адчуджэння ад сям'і, вёскі, ды ад тых, хто радасна танчыў у канфіскаванай Вайтовічавай хаце, прывяла да здрады сваім ідэалам і страты сябе. Ён вымушаны быў удзельнічаць у пераразмеркаванні зямлі, рэпрэсіях аднавяскоўцаў, даваў паказанні НКУС на сябра Царыка. Рэпрэсіўная машына развяла па розныя бакі некалі блізкіх у сваіх марах і спадзяваннях, шчырых маладых людзей, а цяпер – сакратара сельсавета і дачку ворага народа. Так атрымалася, што Міця, не толькі ўдзельнічаў у аперацыі, але сам і арыштоўваў дзяўчыну. На думку Т. Грамадчанкі, В. Адамчык, апісваючы гэту сітуацыю, здолеў сказаць сваё адметнае слова, адрознае ад таго, што ўжо было створана папярэднікамі М. Зарэцкім і В. Быкавым [8, с. 13]. Па меркаванні В. Каваленкі, арыштоўваючы Яніну Вайтовіч, кветку-сімвал роднай зямлі, Корсак здрадзіў самому духу гэтай зямлі і не мае апраўдання [9, с. 244]. У адрозненне ад літаратуразнаўцы, В. Адамчык у тэтралогіі не выказвае адкрытага асуджэння ўчынку свайго героя, як не паказвае і эмацыйнай буры ў яго душы. Аўтар з вялікай сімпатыяй і павагай раскрывае дзявочую сілу духу, годнасць і смеласць, з якой Яніна сустракае арышт, а Корсак хутчэй выклікае шкадаванне, за якім бачна разуменне абсурднай безвыходнасці сітуацыі: нішто не магло ўратаваць Яніну, ды і Міця не мог адмовіцца ад выканання загаду. Разам з тым, на думку Т. Грамадчанкі, і танчыць у Вайтовічавай хаце, перададзенай пад клуб, Корсак бы не стаў [8, с. 13]. Міця, у адрознене ад персанажа В. Быкава з аповесці «Сцюжа», таксама «хітра ўцягнутага ў падзеі 30-х гг.», не зрабіў адназначнага выбару: «Да скону біцца за савецкую ўладу» [8, с. 13]. Для яго гэты выбар быў непрымальным, як не пайшоў да немцаў і не стаў партызанам. Т. Грамадчанка піша аб тым, што Корсаку, з яго перакананнямі, жыццём пры паляках і саветах быў наканаваны свой шлях – трагічны і не ва ўсім маральна апраўданы [8, с. 13].

Пакуты сумлення не дазволілі забыцца на страшную і трагічную ноч, якая неаднаразова ўзнікала ў памяці і згадалася незадоўга да гібелі. З надыходам вайны непрадказальныя перыпетыі жыцця спачатку прывялі самога Міцю да арышту як прадстаўніка Саветаў, а потым да супрацы з антысавецкімі сіламі, забойства партызанкі і выпадковай смерці ад рук аднаго з самых бязлітасных персанажаў тэтралогіі – партызана Рэпкі.

Згадваючы створаныя ў беларускай літаратуры вядомыя вобразы прадстаўнікоў партызанскага руху, Л. Корань адзначала завостраную пісьменнікам неадназначнасць персанажа Жэніка Рэпкі: «У беларускай літаратуры ўжо ёсць такія героі, як Толя Корзун А. Адамовіча, Сцёпка Таўкач, камбрыг Прэабражэнскі, настаўнік Мароз і Брытвін, Антон Галубін В. Быкава, быкаўскія Сотнікаў і Рыбак, Сушчэня і Войцік. Ёсць карнікі А. Адамовіча: не толькі прымітыўнае звяр'ё, але і чалавечыя характары савецкага часу са сваімі вытокамі і гісторыяй. Ды такіх партызанаў, як у апошняй кнізе В. Адамчыка, здаецца не было» [3, с. 173]. З асобай Жэніка Рэпкі, прадстаўніка непаважанага, збяднелага праз ляноту і помслівага роду Катоў, чытач пазнаёміўся яшчэ ў «Чужой бацькаўшчыне». Але ў поўнай меры страшная натура гэтага чалавека раскрылася толькі з прыходам Савецкай ўлады. Ён стаў актыўным удзельнікам і ініцыятыўным праваднікам ідэй новай улады ў жыццё. Ягонае самаапраўданне безгаспадарлівасці праз спадзяванне на тое, што Саветы дадуць новую хату «з вазонамі», ганарыстасць і адчуванне ўсеўладнасці, выклікалі трывогу, бянтэжылі, сталі адной з прычын асцярожнага стаўлення і недаверу да бальшавікоў сярод верасаўцаў. Стары Корсак здзіўляўся: «Але нешта робіцца, раз смаркаты Кот чырвоны бант начапіў. Ідзе, бачу, галаў задраўшы, і ўжо з голай фігай носа яму не дастанеш. Во свет настаў…» [5, с. 352].

З усталяваннем савецкай улады для Рэпкі прыйшоў ягоны час. Жэнік хутка вывучыўся новай лексіцы, меў патрэбную, незаплямленую біяграфію ды расстараўся неабходных дакументаў. Служба ў рабочай гвардыі, а потым у савецкай міліцыі стала магчымасцю вяршыць лёсы людзей, помсціць за былое. Здзіўляючыся з таго, як удала Жэнік прыстасоўваецца ды ўпісваецца ў новае жыццё, Імполь думаў: «Сляпы шашаль нянавісці і злосці точыць яго душу, бо чаго ён дратуе і нішчыць усё, бо чаму помсціць кожнаму?» [6, с. 114]. Г. Тычко адзначала: «Аўтар паказвае, як усё складана і пераблытана ў чалавечым свеце, як немагчыма часам дакладна вызначыць вытокі зла, трагедыі» [10, с. 199]. Апісанне разрабавання мясцовым насельніцтвам асады і жорсткага забойства асадніка Грабянкі Рэпкам стала ілюстрацыяй недапушчальнага, калі чалавек кіруецца нянавісцю і помстай, губляе Боскі страх, а разам з ім і сваё аблічча. Гэта жахлівае здарэнне сімвалічна распачало адлік ахвяр, забітых «сваімі». Мастацкае мысленне пісьменніка пашырыла межы канкрэтнага выпадку, справакаванага класавай варожасцю, да агульначалавечага, гуманістычнага бачання праблемы. Здарэнне стала папярэджаннем пра асцярожнае абыходжанне з любымі, самымі добрымі і справядлівымі, ідэямі. Менавіта ў рамане «Год нулявы» аповед пра прыход Саветаў напоўніўся перасцярогай: «Крый бог, каб свой на свайго руку падняў» [5, с. 395].

Для пісьменніка пазнейшае жыццё Рэпкі, які з пачаткам вайны стаў камандавацьпартызанскай групай, робіцца выкрыццём непрымальнага: калі дзеля ідэі і ў імя «светлай будучыні» і сам чалавек, і яго жыццё перасталі быць каштоўнасцю, не мелі ні шкадавання, ні цаны. Па меркаванні Л. Корань: «… у новым пачэсным званні камандзіра партызанскай групы, Жэнік працягвае сваю зацятую, лютую грамадзянскую вайну» [3, с. 173]. Небяспечныя і непрадуманыя партызанскія аперацыі пад яго кіраўніцтвам не столькі шкодзілі нямецкім акупантам, колькі неслі беды сваім. А лік ахвяр савецкага барацьбіта складаўся не толькі з класавых ворагаў, але і са сваіх аднавяскоўцаў.

Мяркуем, што В. Адамчык праз вобраз Жэніка Рэпкі, дзейнасць яго партызанскай групы, меў на мэце паказаць разнастайнасць праблем акупацыйнага жыцця, імкнуўся ўзбуйніць неадназначнасць тых або іншых падзей, раскрыць складанасць і супярэчлівасць матывацыйнага спектру маральнага выбару. Л. Корань пісала: «На Беларусі вайна 40-х гадоў была катастрофай, бо на гэтую зямлю, на галовы гэтых людзей абрынулася не толькі нечуваная жорсткая агрэсія захопнікаў. Згубнаю стала і тая раз'юшаная лютасць суайчыннікаў адзін да аднаго, што была насаджана таталітарным рэжымам у душах людзей, падзеленых на «чыстых» і «нячыстых» [3, с. 175].

**Заключэнне.** Пераасэнсаванне сацыяльных стэрэатыпаў ва ўзаемаадносінах заходнебеларускага насельніцтва з савецкай уладай пашырае ракурс праблематыкі народазнаўства. Паралелі з мінулым, прадстаўленыя ў тэтралогіі В. Адамчыка, выяўляюць і падкрэсліваюць даўнюю шматпакутнасць лёсу беларусаў, для якіх з надыходам кожнай новай улады становішча не лепшала. Зварот да вопыту жыцця на памежжы дазволіў аўтару зрабіць выснову аб тым, што выпрабавальны ход гісторыі пачаўся задоўга да Другой сусветнай вайны.

Узаемадачыненні заходнебеларускага насельніцтва з савецкай уладай прадстаўлены шматузроўнева і дэталёва і раскрыты з пазіцыі звычайнага вясковага жыхара, яго будзённага клопату, звязанага з надзеяй на зямлю, спадзяваннямі на лепшае і справядлівае жыццё. Аўтар раскрыў праблемы пераразмеркавання зямлі і маёмасці, моўнае пытанне, адлюстраваў шчырыя надзеі верасаўцаў на новую ўладу і расчараванні сацыяльнай палітыкай, паказаў фармалізм, спекулятыўнасць і бюракратызм савецкіх кіраўнікоў. Пісьменнік скрупулёзна пазначаў моманты новага, нязвыклага для жыхароў памежжа, скіроўваючы свой аповед на моманты разыходжання, відавочна «чужога», што маркіравала і вызначала прастору праз савецкае.

Зварот да заходнебеларускай рэчаіснасці ў якасці факталагічнай асновы тэтралогіі дазволіў аўтару закрануць і прадставіць сваё бачанне беларуска-савецкіх стасункаў у адным з найбольш складаных перыядаў нацыянальнай гісторыі XX ст.: з канца 1938 да 1944 гг. У тэтралогіі выразна выяўлена: парушаныя лёсы, калектывізацыя, высылкі і рэпрэсіі – тая цана, якая была заплочана народам новай варожай сістэме. Гістарычныя абставіны зноў блыталі, праводзілі новую мяжу паміж сваімі, адбіралі спадчыннае.

В. Адамчык неаднаразова падкрэсліваў гістарычную «паўтаральнасць» прыніжанага і бяспраўнага палажэння народа, якое не мянялася з прыходам новай улады. Праз будзённы клопат, натуральнае і звычнае жаданне вяскоўцаў мець сваю зямлю і не залежаць ад кожнай новай улады чужынцаў, пісьменнік раскрывае праблемы бездзяржаўнасці і дэнацыяналізацыі. Паводле меркавання А. Рагулі, у тэтралогіі В. Адамчык папярэджвае аб тым, што ў крызісныя эпохі, народ, пазбаўлены ўласнай дзяржаўнасці, спатрэбіцца рэжысёрам крывавых гульняў як пастаўшчык прафесійных забойцаў, а інтэлігентнасць з'яўляецца вельмі кволай гарантыяй гуманістычных паводзінаў [2, с. 12].

Прадстаўлены аўтарам погляд на ўзаемадачыненні заходнебеларускага насельніцтва і савецкай улады дастаткова смелы і альтэрнатыўны ў параўнанні з афіцыйнай ідэалогіяй савецкага часу. Зварот да спрэчных гістарычных момантаў жыцця на памежжы раскрывае праблемы беларускага этнанацыянальнага дыскурсу без павярхоўнасці і спрошчанасці, пашырае тэматыку нацыянальнага самапазнання, з'яўляецца актуальным у сучаснасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Тычка, Г. На неспазнаны круг жыцця / Г. Тычка // ЛІМ. – 1988. – 28 ліст. – С. 6–7.
2. Рагуля, А. У шарым часе. Вячаславу Адамчыку – 60 / А. Рагуля // ЛІМ. –1993. – 29 кастр. – С. 12.
3. Корань, Л. "Што значыць цяпер чалавек?...": па старонках раманаў В. Адамчыка / Л. Корань // Цукровы пеўнік / Л. Корань. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – С. 169–179.
4. Адамчык, В. Чужая бацькаўшчына. Раман / В. Адамчык. – Мінск : ТАА «Папуры», 2015. – 511 с.
5. Адамчык, В. Год нулявы / В. Адамчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – 396 с.

6. Адамчык, В. І скажа той, хто народзіцца: раман / В. Адамчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – 319 с.
7. Адамчык, В. Голас крыві брата твайго: раман, апавяданне / В. Адамчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 287 с.
8. Грамадчанка, Т. Дайсці да праўды. Творчасць Вячаслава Адамчыка / В. Адамчык // Роднае слова. – 1993. – № 11. – С. 8–15.
9. Каваленка, В. Птах з падрэзанымі крыламі / В. Каваленка // Полымя. – 1992. –№ 5. – С. 235–247.
10. Тычко, Г. Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў : час і асобы : вучэб. дапам. / Г. Тычко. –Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2010. – 267 с.

REFERENCES

1. Tychka, G. (1988, 28 November). Na nespaznany krug zhyccja [On the unknown circle of life]. *LIM*, 6–7. (In Belaruss.)
2. Ragulja, A. (1933, 29 October). U sharym chase. Vyacheslav Adamchyk – 60 [At dusk. Vyacheslav Adamchyk – 60]. *LIM*, 12. (In Belaruss.)
3. Koran', L. (1996). «Shto znachyc" cjaper chalavek?...»: pa staronkah ramanaw V. Adamchyka [«What does man mean now?...» : through the pages of the Novels of V. Adamchik]. In L. Koran'. *Cukrovy pewnik [Sugar cock]. Minsk : fiction* (169–179) Minsk: fiction. (In Belaruss.)
4. Adamchyk, V. (2015). *Chuzhaja bac"kawshchyna [Strange Homeland. Novel].* Minsk: LLC «Papury». (In Belaruss.).
5. Adamchyk, V. (1983). *God nuljavy [The Year 00].* Minsk: Fiction. (In Belaruss.)
6. Adamchyk, V. (1987). *I skazha toj, hto narodzicca [And that one who will be born will tell : novel].* Minsk: Fiction. Belarusian. (In Belaruss.).
7. Adamchyk, V. (1991). *Golas kryvi brata tvajgo [The Voice of your brother's blood].* Minsk: fiction. Belarusian. (In Belaruss.).
8. Gramadchanka T. (1993). Dajsci da prawdy. Tvorchasc" Vjachaslava Adamchyka [Get to the truth. Creativity Vyacheslav Adamchik]. *Rodnae slova [Native word], (11*), 8–15. (In Belaruss.).
9. Kavalenka V. (1992). Ptah z padrjezanymi krylami [Birds with clipped wings]. *Polymya [Flame], (5*), 235–247. (In Belaruss.).
10. Tychko, G. (2010). *Belaruskaja litaratura XIX-XX stagoddzjaw : chas i asoby : vuchjebny dapamozhnik [Belarusian literature of the XIX–XX centuries: time and persons : textbook].* Minsk : Belarusian state University of culture and arts. (In Belaruss.).

*Пастуніў 27.01.2022*

## ПЕРЕОСМЫСЛЕНИЕ СОЦИАЛЬНЫХ СТЕРЕОТИПОВ В ТЕТРОЛОГИИ ВЯЧЕСЛАВА АДАМЧИКА

***Н.Г. АПАНАСОВИЧ***

*На материале тетралогии В. Адамчика рассматриваются социальные стереотипы, связанные с приходом советской власти в Западную Беларусь в предвоенное время. В романах отражены проявления советского, маркирующие жизнь на пограничье в это время. Писатель раскрывает проблематику восприятия советской власти местным населением, взаимодействие с ней через призму языкового вопроса, надежды и разочарования социальной политикой, проявление формализма и спекулятивности советских руководителей. Переосмысление данного этапа в истории белорусов В. Адамчик показывает с позиции крестьянина, его повседневной жизни, отношения к перераспределению земли и собственности. Экскурс в недалекую историю позволил писателю провести параллели с происходящим, раскрыть неоднозначность социально-политических и культурно-экономических преобразований любой власти для крестьянина-белоруса. Анализ материала позволяет сделать вывод о позиции писателя: разрушенные судьбы, коллективизация, ссылки и репрессии – та цена, которую заплатил белорусский народ савецкой власти. Представленный в тетралогии ракурс переосмысления социальных стереотипов советского расширяет тематику этнонационального дискурса, является актуальным и на сегодняшний день.*

***Ключевые слова:*** *тетрология, В. Адамчик, Западная Беларусь, советская власть, репрессии, судьба беларуского народа.*

## RETHINKING SOCIAL STEREOTYPES IN THE TETRALOGY BY VIACHESLAV ADAMCHIK

***N. APANASOVICH***

*Based on the material of V. Adamchik's tetralogy, social stereotypes associated with the arrival of Soviet power in Western Belarus in the pre-war period are considered. The novels reflect the manifestations of the Soviet, which mark life on the border at this time. The writer reveals the problems of the perception of Soviet power by the local population, interaction with it through the prism of the language issue, hopes and disillusionment with social policy, the manifestation of formalism and speculativeness of Soviet leaders. Reinterpretation of this stage in the history of Belarusians V. Adamchik shows from the position of a peasant, his daily life, attitude to the redistribution of land and property. An excursion into recent history allowed the writer to draw parallels with what is happening, to reveal the ambiguity of socio-political and cultural-economic transformations of any government for a Belarusian peasant. The analysis of the material allows us to conclude about the writer's position: destroyed destinies, collectivization, exile and repression are the price paid by the Belarusian people to the Savets authorities. The perspective of rethinking the Soviet social stereotypes presented in the tetralogy expands the subject of ethno-national discourse, and is relevant today.*

***Keywords:*** *tetralogy, V. Adamchik, Western Belarus, Soviet power, repressions, the fate of the Belarusian people.*